24. *Рубинштейн С.Ф.* Хронологический указатель указов и правительственных распоряжений по губерниям России, Белоруссии и Малороссии за 240 лет, с 1652 по 1892 год. Вильна, 1894.

# УЗАЕМАПРАНІКНЕННЕ ТАТАРСКАЙ І БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУР

**М. А. Гембіцкая**

Пасяленне часткі татар-мусульман на Беларусі ў сярэднявеччы было важнай гістарычнай з'явай. Яны адыгралі станоўчую ролю ў беларускай нацыянальнай гісторыі. Спрыяльнае становішча татар у ВКЛ садзейнічала іх цеснаму ўзаемадзеянню з мясцовым усходнеславянскім насельніцтвам, палітычнаму і культурнаму зближэнню з ім.

Роля татар-мусульман ў беларускай гісторыі шматзначная. Яны не толькі мужна баранілі зямлю, на якой сталі жыць, але і прынялі ўдзел у такім важным гістарычным працэсе, як беларускі этнагенез.

За стагоддзі, што татары жывуць на новай радзіме, яны шмат пераняліад народаў Беларусі, самі зрабілі пэўны ўплыў на іх. Большасць беларускіх татараў успрыняла шмат аўтэнтычна-беларускага і наадварот.

Спачатку, у XIV–XVI стст., татарскія перасяленцы на Беларусі захоўвалі родную мову і традыцыі ў амаль нязменным выглядзе. Аднак у далейшым, на працягу наступных стагоддзяў, пад уплывам шэрагу фактараў беларускія татары паддаліся асіміляцыйным працэсам, пачалі паступова страчваць сваю мову, часткова веру, некоторыя рысы светаўспрымання, забываць свае старадаўнія абрады, звычаі. У XVII-XIX стст. значная колькасць татарскага насельніцтва карысталася ў паўсядзённым жыцці беларускай ці польскай мовай [3, с. 127].

З цягам часу частка татарскага насельніцтва прыняла хрысціянаства, але ў значнай меры татары, нягледзячы на тэндэнцыю да асіміляцыі, у асноўным усё ж захавалі сваю рэлігію – мусульманства суніцкага толку. Татары імкнуліся зберагчы асобныя самабытныя рысы свайго традыцыйнага гаспадарчага жыцця, хатняга побыту, народнага адзення, фальклору. Алё ў выніку ўзмацнення міжнацыянальных кантактаў, узвемаўплываў культур і моў насяляючых Беларусь народаў этнакультурныя адрозненні паміж татарамі і беларусамі ў XIX – пачатку XX ст. прыкметна зменшыліся, а ў асобных сферах амаль зусім зніклі [3, с. 128].

Тым не менш, беларускія татары, адасобленыя на працягу стагоддзяў ад ісламскага свету, зберaглі сваю веру, традыцыі і культуру. Іслам быў галоўным фактарам, які спрыяў захаванню нацыянальнай свядомасці беларускіх татараў у іншаэтнічным асяроддзі. На беларускіх землях не ўзнікалі міжэтнічныя і міжканфесіянальныя канфлікты паміж татарамі і

іншым насельніцтвам, а ў сувязі з нешматлікасцю адэптаў гэтай рэлігіі ўрад не рабіў ім абмежаванняў. Існуючы побач з іншымі этнасамі, татары здолелі пранесці праз стагоддзі ўсведамленне сваёй нацыянальнай супольнасці, захаваць сваю веру, сацыяльныя, гаспадарчыя і культурныя традыцыі, некаторыя з якіх паўплывалі на традыцыі беларусаў.

Асіміляцыйныя працэсы можна прасачыць праз традыцыі беларускіх татар, якія з цягам часу значна трансфармаваліся, бо татары на Беларусі інтэнсіўна ўспрымалі звычаі і абрады.

Прыкладам відавочнай асіміляцыі татарскага насельніцтва на Беларусі з’яўляюцца народныя святы, якія святкуюцца татарамі разам з беларусамі. Шляхціч мусульманін, паклаўшы першае бярвенне пад зруб хаты, спраўляе «закладзіны», затым, уваходзячы ў новую хату, наладзжвае «уходзіны». Калі татарын сажне першы сноп іржы ў полі, ён ставіць у чырвоным куце сноп – «гаспадара», а калі скончыцца жатва, – «гаспадара» выносіць у гумно, а ў чырвоным куце вешае вянок з іржаных каласоў [4, с. 50].

У вясельнай абраднасці татары спраўлялі звычай пасада нявесты на дзяжу, спявалі беларускія вясельныя песні. Нягледзечы на тое, што па законадаўству ўсім асобам мусульманскай рэлігіі прадастаўлена права шматжонства, літоўскія татары, для якіх выключэнняў не было зроблена, строга саблюдалі манагамію. Звычай гэты заснаваны на старажытным літоўскім заканадаўстве, па якому татарам было прадастаўлена права ажаніцца з хрыціянкамі з адзінай умовай – мець толькі адну жонку. Знікненне гэтага права адносіцца да 1616 г. Звычай аднажэнства саблюдаўся настолькі строга, што некаторыя мулы патрабавалі ад жаніха доказаў, што ён не жанаты. Хяця рэлігія не забараняе шлюбаў у трэццяй ступені радства, але татары не адабралі такія шлюбы [8, с. 70].

Яскравым прыкладам трансфармацыі звычаяў беларускіх татар з’ўляецца тое, што татарская жанчына мае роўныя правы з мужчынай, яна прызнаецца раўнапраўным членам сям'і. У адносінах мужа і жонкі няма нічога, што б магло нагадаць сямейны дэспатызм, характэрны для ўсходніх народаў. Хаця жанчына-мусульманка павінна насіць чадру па нормах шарыяту, татаркі Беларусі не выконваюць гэты абавязак [9, с. 71].

Даволі цікавым звычаем у беларускіх татар з’ўляецца святкаванне вялікадня ў той жа дзень, калі яго святкуюць каталікі, што зусім не прадугледжана ў мусульманскай рэлігіі. Татары загадзя падрыхтоўваюцца да гэтага свята: фарбуюць яйкі, моляцца над імі па Карану, рыхтуюць святочную вячэру. Гэтае свята ўвабрала таксама ў сябе элементы калядавання: дзеці з раніцы ходзяць па хатах, дзе жывуць татары і збіраюць пачастункі (у тым ліку і яйкі) – садагу (садаку).

Такім чынам, татары даволі хутка засвоілі традыцыйныя нормы жыцця, характэрныя для мясцовага насельніцтва. Уплыў беларускіх традыцый і звычак моцна сказаўся на сямейным і абрадавым жыцці беларускага татарына.

Працэс запазычання абрадаў, традыцый, зліцця розных культур не быў аднабаковым. Беларускія татары таксама паўплывалі на традыцыйную культуру беларусаў. Так, татарская традыцыя наклала адбітак на строй беларускага адзення, асабліва жаночага. Гэта добра відаць на прыкладзе так званага Тураўска-Давыд-Гарадоцкага строю, дзе шырока ўжываецца аплікацыя, якая наогул зусім не характэрна для ўсходніх славян [6, с. 164]. Тураўска-Давыд-Гарадоцкі строй – гэта традыцыйны комплекс беларускага народнага адзення Усходняга Палесся. Ён панаваў у асяроддзі мяшчан невялікіх гарадоў (Тураў, Давыд-Гарадок, Столін), мястэчак і буйных вёсак у XIX – пачатку XX ст. [7, с. 15]. Рэзка вылучаўся сярод іншых строяў ускладнёнымі сілуэтамі жаночага касцюма з арыгінальныміт галаўнымі ўборамі замужніх жанчын [6, с. 164].

Экзатычны і падкрэслена самавіты вобраз жаночага касцюма стваралі арыгінальныя галаўныя ўборы – галовачка, падушачка. Жанчыны насілі масіўныя нагрудныя ўпрыгожванні – чаканеныя з латуні вялікія крыжы мясцовай работы, пацеркі з натуральных камянёў і металу, абразкі, а таксама пярсцёнкі [7, с. 164]. Таксама ўплыў татарскай культуры відавочны ў адзенні шляхты: чалма, доўгія халаты з багатай вышыўкай.

Уплыў татарскага этнасу відавочны і ў кулінарыі Беларусі. Вялікая колькасць нацыянальных татарскіх з цягам часу стала любімай сярод беларусаў. Так, напрыклад, пяльмені, якія «прысвойвалі» многі народы, прыйшлі на землі Беларусі разам з татарамі. А яны самі прызвычаіліся да гэтай стравы пасля захопу Кітая, адкуль і запазычылі яе. Пяльмені ў беларускіх татар пачалі называцца цюркскім словам «кундумы», падобныя на польскія калдуны, з той розніцай, што «кундумы» татар больш вялікія і адрозніваюцца начыннем з вельмі тлустага мяса з цыбуляй. У іншых цюркскіх народаў захавалася аналогія гэтай стравы ў выглядзе уральскіх пельменяў і крымсай стравы «татар-аш»; так званыя чэбурэкі ў Крыму і Азербайджане з'яўляюцца яшчэ адной разнавіднасцю гэтай стравы [1, с. 3]. Пірог з начыннем, пераважна з мясам гуся, носіць у татар цюркскую назву «бялюш»; у паволжскіх цюрка-татар існуе аналогія ў выглядзе пірага з начыннем, але пераважна яблычным, пад назвай «беліш». Асаблівае месца адводзіцца халве («гальва») і ляпёшкам па тыпу азербайджанскага лаваша, але меншымі памерамі, якія выраблююцца на алеі, а таксама салодкаму хмельному напою з мёда, які называецца «сыта» [1, с. 4].

Так як беларускія татары ў сваёй большасці былі нашчадкамі крымскіх татар, галоўнымі іх заняткамі былі агародніцтва, насенняводства кветак, апрацоўка скур. Беларускія татары славіліся сваім майстэрствам і высокаякаснай прадукцыяй, што падцвярджаецца вядомай прыказкай: «Татарын – лепшы гаспадарын» [2, с. 34].

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што татары на Беларусі часткова паддаліся асіміляцыйным працэсам. Але ў той жа час яны прынеслі ў беларускую культуру шмат новага і карыснага. Як вынік узаемаўлыву дзвюх культур мы бачым небывалую помесь, своеасаблівы сімбіёз традыцый, культур двух розных народаў, якія больш за 600 год мірна жывуць разам на адной зямлі. Мы па праву можам ганарыцца талерантным стаўленнем да іншых нацыянальнасцей, якія насяляюць землі Беларусі. Менавіта яно падтрымлівае мірныя і сяброўскія міжэтнічныя адносіны на працягу стагоддзяў, выключае магчымасць узрастаня шавінізму або рэлігійнай варожасці.

Спалучэнне культур, рэлігій, этнічных асаблівайсцей дае ў выніку своеасаблівы і ўнікальны сімбіёз нацыянальных рыс, калі спалучаецца на першы погляд неспалучальнае. Гэта падкрэслівае ўнікальнасць і непаўторнасць узаемапранікнення татарскай і беларускай культур.

**Літаратура**


1. *Александрович-Насыфи Дж.* Литовские татары как часть тюркского Востока. Баку, 1927. С. 4.
2. *Гембіцкая М.* Месца татараў у этнічнай структуры насельніцтва Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс, 2005. №11. С. 34.
3. *Дубянецкі С.* Татары на Беларусі: рассяленне, становішча і адносіны з беларускім народам // Першая міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Татары-мусульмане на землях Беларусі, Літвы и Польшчы». Частка 1. Мн., 1994. С. 127-128.
4. *Піліпенка М.* Роля татараў у беларускім этнагенэзе // Першая міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Татары-мусульмане на землях Беларусі, Літвы и Польшчы». Мн., 1994. Частка 1. С. 50.
5. *Раманюк* М. Давыд-гарадоцка-тураўскі строй / Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя. Мн., 1989. С. 164.
6. *Раманюк М.* Беларускія народныя строі. Мн, 2003. С. 15.
7. *Шимилевич М.* Город Лида и Лидский замок: Ист. очерк / М.Шимелевич. 190?. С. 70.
8. *Шпилевский П.* Путешествия по Полесью и белорусскому краю. Мн., 2004. С. 71.


# ЯГАЙЛА І ВІТАЎТ У ГІСТАРЫЧНАЙ СВЯДОМАСЦІ ГРАМАДСТВА ВКЛ І ПОЛЬШЧЫ XV–XVI СТСТ.

**Я. С. Глінскі**

Вітаўт і Ягайла адыгравалі вызначальную ролю ў дзяржаўным жыцці Вялікага княства Літоўскага і Каралеўства Польскага на працягу больш